https://nashaniva.com/?c=ar&i=267348&mo=c67d58d136c2954f8a19c340c10c07c247c3e450

Беларуская топ-мадэль выйшла замуж за шамана — цяпер вучыць гіпнааргазмам

У 2015-м беларуска Валеры Вів’ер спаборнічала за тытул «Топ-мадэлі свету», а пазней сабрала сотні тысяч падпісчыкаў у сваім інстаграме. Цяпер дзяўчыну не пазнаць — замест фота з тусовак яна хваліцца тэлекінэзам і сувяззю з егіпецкімі багамі.

Валеры Вів’ер, яна ж Вольга Болдырава, нарадзілася ў Гродне і скончыла мінскі Лінгвістычны. У пачатку 2010-х дзяўчына завяла сабе блог у інстаграме, дзе выкладала здымкі з падарожжаў, кветкі і ўласныя фоты ў адкрытым адзенні.

Асабліва пра дзяўчыну загаварылі ў 2015-м, калі яна паўдзельнічала ў конкурсе «Топ-мадэль свету» і выйграла ў намінацыі «Каралева Еўропы». Пасля гэтага акаўнт Вольгі-Валеры стаў значна больш папулярны — у наступныя гады колькасць падпісчыкаў пералятала за 600 тысяч чалавек. Мяркуючы па здымках у блогу, тады, у 2010-я, яна была сяброўкай спевака Германа Цітова.

Яшчэ да 2020-га Валеры пачала наведваць Азію, асабліва ёй спадабалася на востраве Балі. У 2018-м беларуска згадала ўдзел у віпасане — рэтрыце, дзе трэба дзесяць дзён маўчаць, займацца медытацыяй і адмовіцца ад гаджэтаў. У 2019-м Валеры ўжо хадзіла на сустрэчы з шаманамі.

Але сапраўды яе змяніў 2020-ы. У тым годзе яна актыўна ўдзельнічала ў духоўных трэнінгах і семінарах, сустрэла каханага і нарадзіла дачку. На сваім сайце Валеры [піша](https://dommaytreyi.ru/), што была замужам за шаманам і нарадзіла ад яго дачку Аяваску.

Цікава, якое імя яна абрала для дзяўчынкі. Аяваска, ці аяўаска — гэта раслінны напой, які выкарыстоўваюць індзейцы, каб наладжваць «кантакт з духамі», той напой мае галюцынагенны эфект.

Зрэшты, у жыцці самой Валеры цяпер шмат іншых цікавостак. Раней яна праводзіла шмат часу на Балі, але ў лістападзе 2025-га напісала ў сваім тэлеграм-канале, што пераехала ў Расію. Яе цяперашні бізнэс, так званы «дом Майтрэі», таксама мае расійскую рэгістрацыю. Пры гэтым Валеры дагэтуль прыязджае на Балі.

Дарэчы, Майтрэя — гэта духоўнае імя, якое цяпер носіць беларуска. Гэта імя будучага Буды, фігуры месіянскага маштабу, то-бок не самы сціплы псеўданім з магчымых.

На сайце «дома Майтрэі» Валеры піша, што мае асаблівыя сувязі са старажытнаегіпецкімі багамі і вядомымі духоўнымі настаўнікамі мінулага.

«Атрымала энергетычныя пячаткі егіпецкага пантэону: Амон Ра, Асірыса, Ісіды, Гора, Сехмет, Хатор. Атрымала энергетычныя пячаткі Амы, Саі Бабы, Шры Рамана Махаршы, Ашо. Працуе з сефіратычнай і рунічнай магіяй».

Таксама беларуска кажа, што валодае метадамі магіі, звязанай з кабалой і са скандынаўскімі рунамі. У дадатак, піша Валеры, яна валодае экстрасэнсорыкай і тэлекінэзам, то-бок рухае прадметы сілай думкі.

Сваімі талентамі Валеры дзеліцца з іншымі. Яна піша на сайце, што за ўвесь час праз яе прайшлі больш за тысячу кліентаў, але калі хочацца да іх далучыцца, можа спатрэбіцца вялікая сума.

Напрыклад, у Валеры ёсць праграма пад назвай «28 дзён сэксуальнасці і грошай». Самы танны ўдзел у ёй каштуе амаль 300 еўра. Ёсць яшчэ гукавая тэрапія — мабыць, Валеры мае на ўвазе тыбецкую практыку спяваючых чашаў.

Нашмат даражэй каштуюць тантрычныя практыкі, якім вучыць Майтрэя. Валеры піша пра сябе, што скончыла ўніверсітэт тантры і правяла два гады ў цэлібаце, каб асвоіць старажытныя практыкі па кіраванні сэксуальнай энергіяй. Яна прызнаецца, што яе спецыялізацыя — навучанне «энергетычнаму сэксу, энергахвалі і кінастэтыцы (кіраванню дотыкам)».

Беларуска нават прапануе чатыры сесіі пад назвай «У вір з галавой», дзе дае самыя закрытыя тэхнікі тантры «для тых, хто гатовы зазірнуць у харомы сваёй сэксуальнасці». Каштуе гэта амаль 3000 еўра.

Дадаткова Майтрэя гатовая навучыць гіпнааргазмам з дапамогай прафесійнага гіпнатызёра.

«Наша Ніва» — бастыён беларушчыны

[ПАДТРЫМАЦЬ](https://patreon.com/nashaniva)

Каментары18